смещаться в сторону изучения политической и экономической систем. Главным для этих ученых стал отказ от бесплодного «кабинетного» теоретизирования в пользу кропотливого сбора эмпирического материала для восстановления уникальности истории каждой культуры, который имеет целью адекватное восприятие культуры других народов, освобождение от «этноцентризма».

**Литература**


1. *Бидни Дэвид*. Культурная динамика и поиски истоков // Антология исследований культуры. Т.1. Интерпретации культуры. СПб., 1997. С. 385–410.
2. *Терешкович П.В.* Антропология // Новейший философский словарь. Мн., 1999. С. 39–41.
3. *Терешкович П.В.* Малиновский, Бронислав Каспар // Новейший философский словарь. Мн., 1999. С. 390, 391.
4. *Kuklick Henrika*. Functionalism // Encyclopedia of social and cultural anthropology. London & NY, Routlege, 1998. P. 246–252.
5. *Kuklick Henrika*. Malinowski, Bronislaw / Encyclopedia of social and cultural anthropology. London & NY, Routlege, 1998. P. 343–345.
6. *Kuper Adam*. Anthropology and anthropologists. London & NY, Routlege, 1996.


# ПАЛІТЫЧНЫЯ ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННІ ПАМІЖ РЭЧЧУ ПАСПАЛІТАЙ І МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВАЙ НАПЯРЭДАДНІ ВАЙНЫ 1609–1618 гг.


**У. Р. Рэут**


На пачатку XVII ст. усходнееўрапейская палітычная сітуацыя вярталася ў старое русла, канчаткова зведзенымі былі адхіленні, выкліканыя войнамі ранейшых гадоў, пошукам нетрадыцыйных хаўруснікаў і спробамі міждзяржаўных уній. Становішча працягвала заставацца гэтакім да пачатку Трыццацігадовай вайны.

Нягледзячы на тое, у палітыцы як Аўстрыі, так і Рэчы Паспалітай абодвух народаў, і Расіі, і Швецыі, на той перыяд пераважаюць рысы пасіўнасці, а вонкавая актыўнасць тлумачыцца імкненнем звязаць патэнцыяльна варожыя намеры замежнікаў уз'яднацца [1]. Тэндэнцыя Кароны і Княства да дасягнення дамінавання ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне падмуркам мела неблагія пачынанні Баторыя – перш за ўсё перамогу ў складанай Лівонскай вайне, усталяванне добрасуседскіх адносін з венскім дворам і падтрымку Ватыкана [2]. У апошняе дзесяцігоддзе XVI ст. палітыка Рэчы Паспалітай арыентавалася на доўгатэрміновае супрацоўніцтва з Маскоўскім царствам, дзеля інтэгравання рускага грамадства і краіны ў цэлым з палітычным ладам

Кароны і Княства [3]. Пасольствы, што ехалі ў Маскву, час ад часу, пачынаючы з 1590 г., прапаноўвалі маскоўскаму ўраду розныя варыянты уній, якія выпрацоўваліся на пасяджэннях «в узком кругу между королем и его ближайшим окружением и руководителями великокняжеской канцелярии».

У 1600 г. Л. Сапега рушыў з вялікім пасольствам у Масковію «для объединения обоих государств под общей властью» [4], але ў той час вонкавае палітычнае становішча Рэчы Паспалітай пагоршала. Апошнім разам пытанне аб «соединении» літоўскія сенатары ўзнялі пры ратыфікацыі перамір'я на ранейшых умовах у Вільні зімою 1601–1602 гг., але дамоўленасці не былі дасягнуты і на гэты раз.

Асноўнымі перашкодамі на шляху да уніі было няўважлівае стаўленне да наяўных праблем кожнай дзяржавы ды адсутнасць талеранцыі і разумення ў вырашэнні спрэчных пытанняў. Рэч Паспалітая абодвух народаў захоўвала рэваншысцкія спадзяванні ў выглядзе патрабаванняў тэрытарыяльнага характару, а Маскоўская дзяржава за Фёдарам Іванавічам імкнулася да свабоды ў дзеяннях супраць Швецыі, у той час калі на троне федэратыўнага гаспадарства сядзеў шведскі наследны прынц, а пасля стаяла за саюз з паўночнай суседкай, калі ўладу ў ёй захапіў дзядзька Жыгімонта III Вазы – Карл Судэрманскі.

Пры Барысе Гадуновым, па сутнасці неблагім правіцелю, Маскоўская дзяржава трапіла ў надзвычай дрэннае эканамічнае становішча дзякуючы форс-мажорнай кан'юнктуры: неўраджаю і голаду пачатку стагоддзя. Палітычная апазіцыя, ва ўсялякім разе, не насмелілася б уступіць у адкрытую канфрантацыю з царом, калі б не было іншага – «легітымнага» прэтэндэнта на трон.

Цар Дзмітрый жа заставаўся даволі папулярным палітыкам, у адваротным выпадку другі самазванец не знайшоў бы шырокай падтрымкі. У значнай ступені менавіта забойства Дзмітрыя паклала пачатак структурнаму крызісу манархічнай улады ў Маскоўскай дзяржаве. Глумленне вулічнага натоўпу над целам цара рушыць цэлы комплекс традыцыйнага светапогляду. Нездарма пасля ўсталявання на троне В. Шуйскі, па парадзе патрыярха Гермагена, арганізуе правядзенне некалькіх акцый усеагульнага пакаяння і масавых малебнаў, якія павінны былі згрупаваць народ вакол царквы і цара. Васіль Іванавіч зрабіў усё магчымае дзеля таго, каб разарваць сувязь у свядомасці людзей паміж асобамі загінуўшага ў Вуглічы Дзмітрыя і Дзмітрыя Іванавіча – цара Маскоўскай дзяржавы.

Стэфан Баторы дасягнуў адноснага поспеху без радыкальнага рэфармавання пачаўшага парахнець дзяржапарата і архаічных фінансаў. Эканамічным падмуркам ваенных паходаў караля заўсёды выступалі грашовыя субсідыі, найперш ад папскага прастола, касцяком вайсковых фарміраванняў былі найманыя пяхотныя харугвы. Ва ўмовах, калі каралеўская ўлада разглядалася ў якасці неад'емнай часткі палітычнага суверэнітэту «шляхецкага народа», рэальны ўплыў караля амаль цалкам залежаў ад яго асабістага аўтарытэту ў дзяржаве [5]. Зыходзячы з гэтага, перамогі, здабытыя без рэформы грамадска-прававой мадэлі шляхецкай рэспублікі, адбіліся ў свядомасці шляхты як прамое сведчанне перавагі і выразнай дасканаласці гэтай сістэмы, значнасці «залатых вольнасцяў».

Жыгімонт III, імкнучыся ўмацаваць краіну, спрабаваў праз сейм, скліканы на 7 сакавіка 1606 г., ухваліць стварэнне сталай арміі і скарбу, заснаванага на сталых падатках, а таксама скараціць магчымасці пасольскай пратэстацыі на сеймах [6]. Першымі незадаволенымі былі магнацкія групоўкі некаталіцкага веравызнання. Справа тычылася каралеўскіх набілітацыі на дзяржаўныя пасады. Колькасць дысідэнтаў, якія ўдзельнічалі ў сеймавай працы, значна паменшала. Напрыклад, лік сенатараў-дысідэнтаў у пачатку праўлення Жыгімонта III складаў дваццаць восем асоб, да пачатку 30-х гадоў XVII ст. іх засталося толькі чатыры, сярод сенатараў-літоўцаў за гэтыя гады лік каталікоў узрос з 26 (56,5 % пратэстантаў, 17,5 – праваслаўных) да 100 % [7].

Рэч Паспалітая займела «wojnu domowu» у выглядзе рокаша пад кіраўніцтвам кракаўскага ваяводы Мікалая Зебжыдоўскага. Падаецца, рокаш надоўга зрабіў неактуальным усялякую спробу ўзмацнення каралеўскай улады ў Рэчы Паспалітай – з 1607 года пры асобе караля пачынаюць дзейнічаць сенатары-рэзідэнты, а ў 1616 годзе сейм прымае адпаведную канстытуцыю, згодна з якой аб'яўленне вайны з'яўлялася выключна ягонай прэрагатывай [8].

Першыя планы, звязаныя з магчымасцю пачатку вайсковай экспансіі супраць Маскоўскага царства, з'явіліся не пазней за 1607 г., калі ўсплываюць на паверхню існаваўшыя раней патаемныя сувязі ракашан Зебжыдоўскага з Дзмітрыем, падчас знаходжання апошняга на прастоле. Жыгімонт III рызыкнуў пачаць вайсковыя рыхтаванні без адабрэння, атрыманага праз сейм у 1609 г. [9]. Штогадовыя прыбыткі караля РП са старостваў і эканомій фармальна складалі каля мільёна злотых, на самой справе грошы ў поўным памеры было атрымаць

даволі цяжка, дзяржаўцы нярэдка затрымоўвалі выплаты. Жыгімонту III даводзілася праз падскарбія земскага Андрэя Завішу звяртацца нават да Мікалая Радзівіла: «Наказуем абы ясневельможны ваявода Трокски зборы з мястечка Шомель и Янишки до скарбу нашего оттать же был повинен» [10]. Увогуле асабістыя расходы караля на вайну склалі 1100 тыс. злотых, прынамсі, пра гэткую суму ішла размова на сейме 1613 года [11].

Былі праведзены паслядоўныя крокі па фарміраванню добразычлівага міжнароднага стаўлення да маючай адбыцца кампаніі. У выніку на захадзе панавала ўражанне аб амаль выключна рэлігійным характары гэтай вайны, звязанай з распаўсюджваннем каталіцтва. Папа Павел V атрымаў прапанову Жыгімонта III аб беатыфікацыі Ігнацыя Лаёлы, кароль Рэчы Паспалітай меў намер зрабіць яго духоўным патронам выправы. Папа палічыў патрэбным даць збавенне тым, хто ідзе ваяваць са схізматыкамі, а ў ноч на Нараджэнне Хрыстова ў 1609 г. благаславіў меч і шалом і адаслаў зброю Жыгімонту III [12].

Калі пралічваць становішча ў першай палове 1609 г. на літоўска-маскоўскім парубежжы, то трэба падкрэсліць значную вагу непадуладных нікому буйных вайсковых атрадаў, чые шэрагі імкліва папаўняліся дэзерцірамі з інфлянцкага тэатра баявых дзеянняў, дзе з пачаткам рыхтаванняў да маскоўскай выправы Жыгімонта III фактычна спынілася сплочванне грошай жаўнерам; авантурнікамі са збяднелай шляхты, казакамі. Жыгімонт III нават спрабаваў выкарыстаць гэтую сілу ў сваіх разліках. Жмудскаму кашталяну Яраславу Рапалеўскаму-Галавачынскаму было даручана весці перамовы з прадстаўнікамі гэтых злучэнняў з мэтай завярнуць іх ад межаў у глыб княства, перагрупаваць і забяспечцць правіянтам, а пасля выкарыстаць іх у будучых вайсковых дзеяннях [13]. Зрэшты, усе гэтыя крокі не былі надта паспяховымі. Збройныя людзі, патэнцыяльныя жаўнеры каралеўскай арміі, падманутыя ўяўнай слабасцю Масквы, сплывалі па-за межы, сілкуючы рэзервы Тушынскага лагера.

Падобна на тое, што галоўнымі прычынамі інтэрвенцыі РП у Маскоўскае царства патрэбна лічыць, па-першае, імкненне караля праз заваяванне маскоўскага прастола наблізіць вяртанне дзедзічнай шведскай кароны; па-другое, жаданне вырашыць унутраныя праблемы Кароны і Княства шляхам скіравання небяспечнай шляхецкай актыўнасці на падрыхтоўку да вайны; па-трэцяе, унутраны закалот у

Маскоўскай дзяржаве пагражаў пашырыцца і на тэрыторыю Рэчы Паспалітай – названая прычына была афіцыйнай версіяй, якую распаўсюджваў кракаўскі каралеўскі двор; нарэшце, не трэба змяншаць ролю з'яўлення вайсковых злучэнняў шведаў на поўначы Маскоўскага царства, што пагражалі блакадай інфлянтам.

Калі разважаць пра неабходнасць інтэрвенцыі праз гледзішча рэтраспекцыі, то даволі празрыстым падаецца тое, што канчатковыя вынікі вайны не былі вырашальнымі, а толькі заклалі аснову дзеля наступных канфліктаў. Паміж Смутай у Маскоўскім царстве і ўнутраным крызісам улады ў РП існуе, безумоўна, вялікая розніца, але калі маскоўская манархія, даволі нечакана, вельмі хутка здолела стабілізавацца, то каралеўская ўлада ў Кароне і Княстве кацілася па нахіленай плоскасці.

Увогуле ж, знешняя палітыка РП да Маскоўскага царства залежала ў першую чаргу ад вонкавай палітычнай кан'юнктуры, таму змест яе перманентна цярпеў сутнасныя змяненні, ад праграмаў, разлічаных на доўгатэрміновае супрацоўніцтва, да спарадычных непаслядоўных крокаў, канстантай заставалася толькі пазіцыя моцнага, на падставе якой грунтаваліся і выпрацоўваліся палітычныя памкненні. На той час здавалася, што Рэч Паспалітая абодвух народаў магла гэта сабе дазволіць.

**Літаратура**


1. *Форстен Г.В.* Балтийский вопрос в XVI–XVII вв. Т. 2. СПб., 1894. С. 162.
2. *Пирлинг П.* Дмитрий Самозванец. Ростов н/Д, 1997. С. 27.
3. *Флоря Б.Н.* Русско-польские отношения и балтийский вопрос в конце XVI начале XVII в. М., Наука, 1973. С. 258.
4. Там же. С. 247.
5. *Bardah J.* Dzieje sejmu polskiego. Warszawa, Wyd-wo sejmowe, 1993. S. 49.
6. *Podhorodecki L.* Slawni Hetmani Rzeczypospolitej. Warszawa, Mada, 1994. S. 180.
7. *Chlapowski K.* Elita senatorsko-dygnitarska korony za czasow Zygmunta III i Wladyslawa IV. Warszawa, 1996. S. 33.
8. *Bardach J.* Dzieje sejmu polskiego. Warszawa. S. 56.
9. Krulowie elekcyjni. Leksykon Biograficzny. Kraków, Wyd-wo Literackie, 1997, S. 57.
10. НГА РБ, ф. 694, оп. 1, ед. 169. Л. 34.
11. *Пирлинг П.* Дмитрий Самозванец. С. 340
12. Там же, С. 401.
13. *Polak W.* O Kreml i smolenszczyzne. Polityka Rzeczypospolitej wobec Moskwy w latah 1607–1612. Toruń, ABC, 1995. S. 46.